ДУК “Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса”
Уздзенская раённая дзіцячая бібліятэка

# Кандрат Крапіва – старэйшы беларускі байкапісец

## Літаратурна-пазнавальная гульня “Зорная гадзіна”

**Выпуск 2**

Узда – 2016

Прапануем вашай увазе серыю сценарных матэрыялаў “Літаратурная эстафета”. Штомесячныя выданні 2016 года прысвечаны творчасці пісьменнікаў-землякоў Уздзеншчыны.

У другім выпуску размешчаны сцэнарый літаратурна-пазнавальнай гульні “Зорная гадзіна” па творчасці Кандрата Крапівы і спіс твораў аўтара, якія знаходзяцца ў дзіцячай бібліятэцы.

**Мэты:**

Стварыць умовы для паўтарэння і сістэматызацыі ведаў па творчасці К.Крапівы.

Садзейнічаць развіццю памяці, уважлівасці, хуткасці мыслення, самастойнасці пры выкананні заданнняў.

Спрыяць фарміраванню адказнасці за свае дзеянні.

Падтрымліваць цікавасць да вывучэнння роднай мовы і літаратуры.

**Журы:** запрошаныя госці.

**Правілы правядзення літаратурна-пазнавальнай гульні "Зорная гадзіна"**

1. У гульні удзельнічае 5 чалавек.
2. Яна праходзіць у 4 туры. Адбор праводзіцца такім чынам: вядучы задае пытанні, тыя, хто на іх дасць правільны адказ і будуць удзельнікамі гульні.
3. За кожны правільны адказ у час гульні удзельнік атрымлівае зорку.
4. У канцы кожнага тура ігрок, які набярэ меньш за ўсіх зорак, выбывае з гульні.
5. Удзельнікі даюць адказы з дапамогай таблічак, на якіх напісаны нумары.

# З О Р Н А Я   Г А Д З І Н А

**Пытанні да прысутных:**

1. У якім годзе нарадзіўся Кандрат Крапіва?

   /1986г./
2. Дзе нарадзіўся пісьменнік?

   /в.Нізок Уздзенскага раёна/
3. Кім быў па прафесіі К. Крапіва?

   / настаўнік /
4. У якіх жанрах пісаў К.Крапіва?

   /байка, верш, п’еса, раман/
5. У якім беларускім сатырычным часопісе працаваў пісьменнік?

   / “Вожык”/

**1 тур:**

**6 партрэтаў:** 1. А.Пальчэўскі
2. А. Якімовіч
3. Д. Слаўковіч
4. К. Крапіва
5. П. Трус
6. А. Бялевіч

**Пытанні да удзельнікаў:**

1. Пяру гэтага пісьменніка належыць шмат твораў для дзяцей. Сярод іх такія, як “Адкуль ліха на свеце”, “Каваль Вернідуб” і іншыя. / 2 /
2. Гэты пісьменнік нам вядомы не толькі па творах. Некаторы час ён быў загадчыкам дзіцячай бібліятэкі. / 3 /
3. Хто з гэтых людзей прысвяціў сабе словы:

Я ў мастацкім агародзе

Толькі марная трава.

А якая? Смех, дый годзе:

Я – пякучка... /4 /

**6 герояў:** 1. Баран

2. Баба
3. Парсюк
4. Конь
5. Жаба
6. Сабака

**Пытанні да удзельнікаў:**

1. У якога героя К. Крапівы была слабая галава і ён не пазнаваў сваіх варот? / 1 /
2. Ён "...такі меў выгляд важны, што носа не дастаць і сажнем..." Каго характарызуюць гэтыя радкі? /3 /
3. Хто з герояў К. Крапівы важыў сама меней 7 пудоў? / 2 /

**2 тур:**

З літар, якія вы зараз убачыце, вам патрэбна за адну хвіліну скласці слова. Але майце на ўвазе, што той удзельнік, у якога будзе самае кароткае слова, пакіне гульню.

**К Д О А Р Н ***

Замест зорачкі можна паставіць любую літару.

**Гульня з гледачамі.**

Сябры, вы таксама можаце паказаць нам сваі здольнасці. Той з вас, хто прыдумае самае доўгае слова з гэтых літар, выкарыстоўваючы таксама зорачку, атрымае прыз.

/ Пасля гульні з гледачамі праглядваюцца словы, складзеныя удзельнікамі гульні./

**3 тур:**

**3 героі:** 1. Сабака
2. Жаба
3. Конь

Я сцвярджаю, што ўсе гэтыя героі сустракаюцца ў байках К. Крапівы. / 0 /

**3 творы:** 1. "Страказа і Муравей"
2. " Партызаны"
3. " Саманадзейны Конь"

Я лічу, што гэтыя творы напісаў К. Крапіва.     / 1 /

**3 творы:** 1. “ Брама неўміручасці”
2. “ Хто смяецца першым”
3. “ Жаба ў каляіне”

Назвы твораў К. Крапівы вельмі разнастайныя. Калі вы лічыце, што ў гэтых назвах ёсць памылка, падыміце нумар.   / 2 /

**4 тур:**

Вось мы і дайшлі да фінала. У К. Крапівы ёсць такая паэма “Шкірута”. З дапамогай гэтай назвы мы даведаемся, хто будзе пераможцам нашай гульні. За 1 хвіліну неабходна з літар гэтага слова скласці як мага больш сваіх слоў. Пераможцам стане той, хто назаве апошняе слова.

## Творы Кандрата Крапівы

1. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. Т. 1 : Вершы, байкі, эпіграмы, паэмы / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 1997. – 462с.
2. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. Т. 2 : Апавяданні / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 1997. – 47 с.
3. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. Т. 3 : Раман, п’есы / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2000. – 382с.
4. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. Т. 4 : П’есы / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2003. – 399с.
5. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. Т. 5 : П’есы, пераклады / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2004. – 44 с.
6. Крапіва, К. Збор твораў : у 6 т. Т. 6 : Пераклады, артыкулы, выступленні, інтэрв’ю, пісьмы, дадатак / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2004. – 447с.

7. Крапіва, К. Выбраныя творы : байкі, вершы, эпіграмы / Кандрат Крапіва. — Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П.Броўкі, 2013. – 272с.

8. Крапіва, К. Байкі і вершы / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2002. – 230с.

9. Крапіва, К. Брама неўміручасці : камедыі / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2015. – 125с.

10. Крапіва, К. Загадкі дзеда Кандрата / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 1986. – 24с.

11. Крапіва, К. На вастрыі : п'есы, апавяданні, вершы і байкі / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 2016. – 383с.

12. Крапіва, К. Пучок жыгучкі / Кандрат Крапіва. — Мінск : Маст. літ., 1973. – 79с.

13. Крапіва, К. Сорак баек / Кандрат Крапіва. — Мінск : Беларусь, 1966. – 144с.

Кандрат Крапіва – старэйшы беларускі байкапісец: літаратурна-пазнавальная гульня "Зорная гадзіна" / ДУК "Уздзенская цэнтральная раённая бібліятэка імя П.Труса"; Уздзенская раённая дзіцячая бібліятэка; [склад. Т.У. Іванова]. – Узда, 2016. – 8с.